# ПОЛАЦК – НАША ПАМЯЦЬ І ГОНАР

**Напрыканцы мая 2012 года Полацк будзе святкаваць сваё 1.150-годдзе. Дзень нараджэння «патрыярха беларускіх гарадоў» унесены ў каляндар міжнародных памятных дат ЮНЕСКА на 2012-2013 гады.**

Полацк, адзін з самых старажытных гарадоў Усходняй Еўропы, упершыню згадваецца ў Аповесці мінулых гадоў пад 862 годам. Выгаднае геаграфічнае становішча на шляху «з варагаў у грэкі» садзейнічала таму, што Полацк стаў адным са значных гандлёвых і культурных цэнтраў сярэдневяковай Еўропы. Тут зарадзілася беларуская дзяржаўнасць і культура, з'явіліся на свет Еўфрасіння Полацкая, Францыск Скарына, Сімяон Полацкі. Адсюль родам герой абароны Порт-Артура генерал Раман Кандраценка, заснавальнік беларускага кіно Юрый Тарыч. У Полацку знаходзіцца амаль 150 гістарычных каштоўнасцей, сярод якіх унікальныя помнікі старажытнай архітэктуры – Сафійскі сабор і Спаса-Праабражэнская царква.

Да дня святкавання юбілею аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі падрыхтаваў выставу «Славен град Полоцк», на якой прадстаўлены выданні полацкіх друкарняў, матэрыялы пра гісторыю горада і знакамітых палачан. Яна адкрыецца 17 мая пад час прэзентацыі факсімільнага выдання ў дзвюх кнігах Издательства Белорусского Экзархата – «Житие блаженной Евфросинии, игумении монастыря Вседержителя Святого Спаса во граде Полоцке» (спіс сярэдзіны XVI стагоддзя з фондаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу). Гэта адзін з найбольш ранніх помнікаў усходнеславянскай агіяграфіі. Першапачатковы тэкст «Жития» нікому не знаёмы, да нашых дзён дайшлі толькі перапрацаваныя тэксты.

На экспазіцыі будуць таксама гістарычныя крыніцы XVI-XX стагоддзяў. Наведвальнікі пазнаёмяцца з выданнямі Полацкага езуіцкага калегіўма XVIII стагоддзя, гістарычнымі хронікамі XVI стагоддзя на польскай і лацінскай мовах: Мацея Стрыйкоўскага «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі» (1582), Аляксандра Гваньіні «Хроніка Еўрапейскай Сарматыі» (1611), якія ўключаюць звесткі перыяду Лівонскай вайны (1558-1583), у ходзе якой Полацк неаднаразова станавіўся аб'ектам заваявання.

Асобны раздзел выставы адведзены кнігам полацкіх друкарняў. Перш за ўсё гэта выданні тыпаграфіі Полацкага езуіцкага калегіума (з 1812 года – Полацкая езуіцкая акадэмія), якія дзейнічаў у 1787-1820 гадах. Пры друкарні была словалітня. Шрыфты атрымлівалі з Пецярбурга і Варшавы. Сярод кніг выставы – падручнікі для вучняў па ўсеагульнай геаграфіі і гісторыі Рыма, па граматыцы лацінскай мовы, майстэрстве рыторыкі, слоўнікі, творы пісьменніка І.Беніслаўскага, выданні рымскіх пісьменнікаў Гарацыя, Цыцэрона. З канца XVIII стагоддзя ў друкарні выходзіў «Каляндар полацкі», дзе змяшчаліся краязнаўчыя матэрыялы (у тым ліку пра Полацк), звесткі па гуманітарных і фізіка-матэматычных навуках, крытыка-бібліяграфічныя агляды, пераклады, апісанні падарожжаў. З 1818 года да лютага 1820-га друкаваўся адзін з першых часопісаў на тэрыторыі дарэвалюцыйнай Беларусі – «Miesięcznik Połocki» («Полацкі месячнік»), першы нумар якога за 1818 год у экспазіцыі.




Ураджэнцам Полацка быў выдатны дзеяч культуры агульнаеўрапейскага маштабу Сімяон Полацкі. Вясной 1664 года, каб пазбегнуць рэпрэсій з боку польскіх улад, Полацкі назаўсёды пераехаў у Маскву. Пасля гэтага пачаўся росквіт паэтычных здольнасцей Сімяона Полацкага. За гады жыцця ў Маскве (1664-1680) паэт напісаў вялікую колькасць вершаў, дзве п'есы, некалькі твораў царкоўна-рэлігійнага характару, пераклаў на вершы і ў 1680 годзе выдаў «Псалтирь рифмотворную», якая з'явілася першым друкаваным паэтычным зборнікам у Маскоўскай Русі. З гэтым выданнем Сімяона Полацкага можна пазнаёміцца ў рамках асноўнай экспазіцыі выставы.

На выставе прадстаўлена шмат кніг XIX – пачатку XX стагоддзя па гісторыі і культуры Полацка. У заключнай частцы экспазіцыі падабраны выданні пра знакамітых людзей Полацка, у прыватнасці кнігі, прысвечаныя жыццю і асветніцкай дзейнасці Е.Полацкай. У фондах ЦНБ НАН Беларусі



захоўваецца некалькі прац, прысвечаных дзеду Еўфрасінні – полацкаму князю Усяславу, які быў, па сутнасці, заснавальнікам беларускай дзяржаўнасці. Асноўная крыніца біяграфічных даных пра асветніцу – яе жыццяпіс. У фондах ЦНБ НАН Беларусі ёсць некалькі друкаваных варыянтаў «Жыццяпісу», перавыданні больш позніх часоў.

Да гэтага ж раздзела выстаўкі падабраны выданні пра жыццё і дзейнасць Сімяона Полацкага (самае ранняе даследаванне 1887 года «Личность и деятельность Симеона Полоцкого»), Францыска Скарыны («Доктор Франциск Скорина, его переводы, печатные издания и язык» П.В.Владимирова, 1888 г.) і інш.

**Алена ДЗЕНІСЕНКА,**
**навуковы супрацоўнік**

**Алена ЧАРНЯЕВА,**
**галоўны бібліятэкар**
**аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў**
**ЦНБ НАН Беларусі**